# РАЗДЕЛ 2

## ЭТНАПЕДАГОГІКА МАЗЫРСКАГА ПАЛЕССЯ*

*Болбас В.С. (УА МДПУ імя І.П. Шамякіна)*

Пры ўсёй разнастайнасці падыходаў да вызначэння ролі і месца традыцыйнай народнай культуры ў жыцці сучаснага грамадства даследчыкі ўсё больш сыходзяцца на разглядзе этнапедагогікі ў якасці найважнейшага інструмента пабудовы на этнакультурнай аснове агульнай адукацыі, якая мае на мэце авалоданне каштоўнасцямі нацыянальнай і сусветнай культуры.

Прынцып культуразгоднасці выхавання не толькі падкрэслівае неабходнасць арганізацыі навучальна-выхаваўчага працэсу з апорай на сацыяльна-культурныя асаблівасці месца і часу яго працякання, а катэгарычна заключае аб невысокай эфектыўнасці выхавання ў выніку адрыву ад нацыянальных каранёў. Таму невыпадкова, што сёння назіраецца павышаная цікавасць да этнапедагагічных, рэгіянальных аспектаў развіцця адукацыі і выхавання.

Гістарычны народны вопыт паказвае, што выхаваўчая культура этнічных супольнасцей, асобных рэгіёнаў і нават розных мясцовасцей абапіраецца на характэрныя адрозненні навакольнага асяроддзя як прыроднага, так і сацыяльнага. Кожны народ мае сваю імпліцытную педагагічную канцэпцыю, якая адлюстроўвае вітальныя і ментальныя асаблівасці этнасаў у выхаванні дзяцей. Задача педагагічнай навукі заключаецца ў тым, каб найбольш поўна і дакладна вывучыць народна-выхаваўчыя ідэі і зрабіць іх дзейснымі крыніцамі сілкавання сучасных тэарэтычных распрацовак. Галоўным напрамкам выкарыстання вопыту нашых продкаў з'яўляецца не экстрапаляцыя тагачасных рэалій у сучаснасць, а развіццё на яго аснове новых падыходаў, якія дапамогуць вырашаць многія сённяшнія праблемы.

На беларускіх землях адным з самых адметных і своеасаблівых з'яўляецца палескі рэгіён. Дзякуючы геаграфічнаму фактару на Палессі фарміравалася даволі самабытная культура, якая менш чым у іншых месцах Беларусі падвяргалася знешняму ўплыву. Вартасныя арыентацыі палешукоў, адшліфаваная жыццём і часам сістэма народных каштоўнасцей уяўляюць сабой адлюстраванне лепшых набыткаў цывілізацыі. У сваю чаргу на Беларускім Палессі самастойна-значнае

* Работа выполнена в рамках проекта БРФФИ Г05П-014.





месца па шэрагу сацыяльна-культурных характарыстык выдзяляецца Мазырска-Прыпяцкі рэгіён. Вядомы народазнаўца Я. Карскі адносіў Прыпяцкае Палессе да прарадзімы славянскіх народаў [1]. Тут на працягу стагоддзяў была выпрацавана непаўторная традыцыйна-пабытовая культура, найважнейшым аспектам якой з'яўляецца педагагічны. Адладжаная жыццём і часам народна-выхаваўчая сістэма Мазырскага Палесся ўяўляе сабой неацэнны скарб і пасяхова можа выкарыстоўвацца як тэарэтычнымі распрацоўшчыкамі пытанняў сучаснага выхавання, так і практычнымі арганізатарамі гэтага працэсу.

Адной з характэрных асаблівасцей этнапедагагічных ідэй Мазырскага Палесся была выразная акцэнтацыя ўвагі выхавацеляў на вызначэнне канкрэтных мэт у гадаванні дзяцей. Аналіз педагагічнай спадчыны палешукоў дае ўсе падставы сцвярджаць, што ў якасці галоўнай мэты вылучаўся выхаваўчы ідэал, надзелены сукупнасцю пэўных рыс і якасцей. Прычым такі ідэал меў выразную дыферэнцыяцыю ў залежнасці ад полу выхавальніка. З хлапчука павінен быў вырасці руплівы, дбайны гаспадар, надзейны стваральнік будучай сям'і. З дзяўчыны – паслухмяная, умелая, старанная гаспадыня, стваральніца і захавальніца сямейнага ачагу. Адной з характарыстычных асаблівасцей народна-выхаваўчых ідэй палешукоў з'яўляецца выразная арыентацыя на высокі маральна-духоўны ўзровень гадаванцаў. Пры вывучэнні маральнай і духоўнай культуры Мазырскага Палесся вядомы рускі гісторык XIX ст. І. Сербаў адзначаў, што маральна-духоўныя якасці беларусаў-сакуноў павінны стаць узорам для пераймання для ўсіх жыхароў Расійскай імперыі [2, с. 48]. Высакародства палешукоў пераўзыходзіць лепшыя ўзоры аналагічных якасцей еўрапейскіх рыцараў сярэднявечча.

Практычна на кожным этапе сталення дзяцей вылучаліся канкрэтныя выхаваўчыя задачы. Стрыжнем і важнейшым змястоўным напаўненнем народнага выхавання з'яўлялася працоўнае выхаванне. Падрыхтоўка да працы, выхаванне працай і ў працы дазваляе многім даследчыкам увогуле народную педагогіку лічыць педагогікай працы [3, с. 57]. Хаця трэба адзначыць, што такі падыход назіраецца не ва ўсіх народаў. Гісторыя дае нам прыклады, калі на першы план маглі вылучацца іншыя бакі жыццядзейнасці грамадства, і нават грэблівыя адносіны да працы, у першую чаргу фізічнай, калі апошняя разглядалася ў якасці пакарання за шматлікія правіннасці. Падобных праяў у палешукоў ніколі не назіралася. Каляндарна-абрадавая паэзія Мазырскага Палесся, якая грунтавалася на прыроднай аснове, самае пачэснае месца адводзіць працы і адпаведным адносінам да яе.

У палешукоў уключэнне дзяцей у працоўную дзейнасць адбывалася паступова, пачынаючы з самага ранняга дзяцінства. Ужо пяцігадовыя дзеці мелі пэўныя пастаянныя і часовыя даручэнні, такім чынам гэта была не "гульня ў працу", а рэальная вытворча-карысная працоўная дзейнасць. З ростам дзяцей іх удзел у вядзенні гаспадаркі пашыраўся і паглыбляўся. Ужо ў падлеткавым узросце яны нароўні з дарослымі былі ўключаны практычна ва ўсе віды працоўнай дзейнасці, валодалі пэўнымі прафесіянальнымі ўменнямі і навыкамі. Ранняе ўключэнне дзяцей ў працу садзейнічала таксама фарміраванню ў іх грамадска-значных, маральна-валявых, інтэлектуальна-разумовых, эстэтычна-арыентаваных, фізічных і іншых якасцей.

Адным з найважнейшых складаемых змястоўнага напаўнення выхаваўчых мэт на Мазырскім Палессі з'яўляецца развіццё абшчынна-таварысцкай, калектывісцкай арыентацыі кожнага індывіда. У сілу прыродна-кліматычных і сацыяльна-палітычных умоў у пойме ракі Прыпяць была створана даволі замкнёная, досыць адасобленая ад знешняга ўплыву тэрыторыя, насельнікі якой яшчэ з дахрысціянскіх часоў вялі абшчынна-калектывісцкі лад жыцця. Не зусім спрыяльныя ўмовы для арганізацыі земляробства і жывёлагадоўлі садзейнічалі аб'яднанню людзей у пэўныя супольнасці, каб разам ладзіць штодзённы побыт.

Хрысціянства хоць і надало новае гучанне калектывізму, але разам з тым закладвала падмурак развіццю ідэй індывідуалізму, бо адбывалася ўзвышэнне кожнага індывіда. Хрысціянскія запаветы звернуты перш за ўсё да ўнутранага свету чалавека, да яго ўласнага сумлення. На Палессі ж як нідзе ў іншых месцах хрысціянскае веравучэнне прымалася дапасавана да язычніцкіх уяўленняў. Тут уласная годнасць, асабістае шчасце разглядаліся толькі ў рэчышчы імкнення да агульнага дабра, задавальнення інтарэсаў канкрэтнага грамадства.

Выхаванне дзяцей, наогул усё жыццё кожнай канкрэтнай сям'і не маглі працякаць па-за ўвагай аднавяскоўцаў. Грамадская думка не толькі ўхваляла ці ганьбавала ўчынкі і паводзіны асобных людзей, а выносіла прысуд аж да выгнання з вёскі.

Наяўнасць мэтавых установак у фарміраванні асобы арыентавала на развіццё адпаведных рыс і якасцей выхаванцаў. На першы план у палешукоў выдзяляліся такія, як таварысцкасць, добразычлівасць, чуласць, шчырасць, спагадлівасць, міласэрнасць, гасціннасць.

Асаблівасці геаграфічна-кліматычных умоў садзейнічалі фарміраванню ў жыхароў Палесся такіх якасцей, як упартасць, цягавітасць, памяркоўнасць, разважлівасць. Адсутнасць бяскрайніх прастораў, замкнёнасць навакольнага асяроддзя спарадзілі ў палешукоў такія якасці,





як стрыманасць, нерашучасць, меланхалічнасць, кансерватызм, насцярожанасць, замкнёнасць. Больш чым у іншых беларусаў у свядомасці насельнікаў Палесся істотнае месца займаюць міфалагічна-містычныя, ірацыянальныя ўяўленні і ўсялякія забабоны, прымхі.

Даследчыкі адзначаюць аб прыкметнай "спавернутасці" менталітэту нашых продкаў да мінулага, былых нормаў жыцця і традыцый [4, с. 80]. Палешукі досыць асцярожна адносяцца да ўсяго новага.

Скарбонка вуснай народнай творчасці Мазырскага Палесся дазваляе зрабіць вывад, што змест народнага выхавання каштоўны не проста наяўнасцю ў ім адпаведных рыс і якасцей асобы, а рэальным іх праяўленнем у актыўнай дзейнасці. Добрыя справы вызначаюць вартасць чалавека. Стваральная дзейнасць на карысць грамадства з'яўляецца крытэрыем выхаванасці асобы.

Патрыятызм палешукоў мае больш абмежаваны характар, чым у прадстаўнікоў іншых народаў. Звычайна ён зводзіцца да паняцця навакольнай рэчаіснасці. Радзіма, Бацькаўшчына прадстае ў якасці "роднага краю", "мілага куточка", "сваёй вёскі", "бацькоўскай хаты". Палешукі былі цесна звязаны са сваімі мясцінамі, роднай зямлёй. Патрыятызм у іх меў выразна лакальную абмежаванасць і лірычны характар, які праяўляўся ў замілаванні навакольнымі краявідамі. Іншыя ж мясціны не толькі не вабілі, а нават выклікалі адмоўныя адносіны, выступалі ў якасці "чужой, нялюбай старонкі". Нічым нельга было спакусіць палешука пакінуць землі продкаў. "Бацькаўшчыну не купляюць і не прадаюць" [5, с. 156] – катэгарычна заключалі на Палессі.

Важнае месца адводзілася на Палессі выхаванню такіх якасцей, як павага да старэйшых, шанаванне сваіх бацькоў. Нават дарослыя дзеці, якія мелі сваіх дзяцей, ва ўсім безадгаворачна слухаліся састарэлых бацькоў.

Нягледзячы на тое, што абсалютны прыярытэт ва ўсіх стратэгічных пытаннях арганізацыі жыцця адводзіўся мужчыне, навукоўцы адзначаюць, што ў палешукоў становішча жанчыны вызначалася ўстойлівай грамадскай павагай. Асабліва істотнай была яе роля ў гадаванні дзяцей. Выхаванне дачок практычна цалкам і поўнасцю ляжала на яе плячах, а ў выхаванні сыноў яна прымала самы актыўны ўдзел. Менавіта дзякуючы яе актыўнасці ў гэтым працэсе і фарміраваліся ў палешукоў такія якасці, як гуманізм, чуласць, добразычлівасць, лірызм душы і інш.

Сур'ёзную ўвагу ўдзялялі на Палессі разумоваму выхаванню. Нягледзячы на тое, што фактару спадчыннасці надавалася важнае значэнне, лічылі, што шляхам уласных намаганняў з дапамогай настаўніка выхаванец многага можа дабіцца ў сваім развіцці. З павагай

ставіліся на Палессі да ведаў, да адукаванасці, кнігі. У XIX ст. у адной з палескіх вёсак запісана такая прыказка аб кнізе: "Бывъ собі дурень на дошку дывывса, зробывса розумный" [6, с. 169].

Шмат клопату праяўлялі палешукі аб здароўі дзяцей, і хоць фізічнае выхаванне як правіла не вычлянялася ў самастойны працэс, але і ў гульнях, і ў працы, якія былі насычаны ўсемагчымымі фізічнымі нагрузкамі, гартаваліся і развіваліся хлапчукі і дзяўчынкі. Міхалон Літвін, аўтар сацыяльна-палітычнага трактата "Аб норавах татар, літоўцаў і маскавіцян", надрукаванага ў 1615 годдзе, зазначае, што людзі, якія жывуць на беразе ракі Пціч з малых гадоў прывыкаюць плаваць, лавіць рыбу, паляваць. Пастаянныя практыкаванні спрыяюць адточванню і загартоўцы прыроджаных фізічных дадзеных і асаблівасцей характару: спрыту, сілы, смеласці, стойкасці і самаахвярнасці. З тых, хто прывык да небяспекі, вырастаюць дужыя і смелыя салдаты, здольныя абараніць дзяржаву [7, с. 48].

Многіх даследчыкаў захапляюць адносіны палешукоў да прыгожага. Эстэтыка прысутнічала практычна ўсюды: у штодзённым побыце, святах, ва ўсіх элементах матэрыяльнай і духоўнай культуры.

На працягу многіх стагоддзяў на Палессі сфарміравалася даволі адладжаная, самабытная сістэма гадавання дзяцей, якая будавалася на выяўленых заканамернасцях, на аснове якіх вылучаліся адшліфаваныя жыццём і часам патрабаванні да выхаваўчага працэсу. Адметнасцю народна-выхаваўчых патрабаванняў было тое, што яны ўлічвалі не толькі індывідуальныя і ўзроставыя асаблівасці дзіцяці, а і традыцыйна-пабытовыя ўмовы яе развіцця, а таксама спецыфіку форм культуры, яе нацыянальныя і рэгіянальныя адметнасці.

Найважнейшае патрабаванне, якое імпліцытна прысутнічала ў поглядах на працэс гадавання дзяцей, заключалася ў прытрымліванні цеснай сувязі з прыродай. Тут існавала патрабаванне ўліку прыроды чалавека і навакольнай жывой і нежывой прыроды. Сама прырода з'яўлялася ў палешукоў адным з найбольш дзейсных выхаваўчых сродкаў. Усведамленне арганічнай злучанасці з прыродай, садзейнічалі правядзенню прамых аналогій паміж асобнымі прыроднымі з'явамі і працэсамі і выхаваннем дзяцей. Прыймальна да сітуацыі выхавацелі ўзбройваліся пэўнымі "педагагічнымі" ведамі: "Гні галінку пакуль маладзенька" [5, с. 116], "Няроўны лес, ня роўныя людзі" [5, с. 109], "Гэта яшчэ цвет, а ягады будуць" [5, с. 153] і інш.

Выніковасць традыцыйнага выхавання вызначалася яго цеснай сувяззю з жыццём, само выхаваўчае ўздзеянне як правіла не было яўна выражаным, яно арганічна ўпляталася ва ўсе грані штодзённага быцця.





Як і ў іншых народаў сама маральна-выхаваўчая сістэма будавалася на шматвяковых традыцыях, што не толькі шліфавала адпаведныя выхаваўчыя падыходы, пастаянна іх карэкціравала, узбагачала, а і праз цыклічную паўтараемасць рабіла вынікі больш трывалымі, а сам працэс патрабаваў меншых намаганняў для яго арганізацыі.

Дзякуючы пераемнасці міжпакаленная сувязь у сем'ях палешукоў была вельмі цеснай. У выхаванні самы актыўны ўдзел прымалі бабулі і дзядулі, дзядзькі і цёткі і іншыя кроўныя сваякі. Такое кола выхавацеляў пашыралася за кошт названых сваякоў – хросных, бабкі павітухі. Не заставаліся ў баку ад выхаваўчых працэсаў суседзі, аднавяскоўцы. Прычым важным было патрабаванне ўзаемаўзгодненасці выхаваўчых намаганняў.

У палескіх сем'ях адносіны да дзяцей былі строгімі, патрабавальнымі, але не даходзілі да такіх жорсткіх форм, як у цэнтральных рэгіёнах беларускіх зямель, хаця і там яны былі больш мяккімі, чым у суседніх краінах. "Ад дубцоў дурнеюць, ад слоўцаў разумеюць", – разважалі палешукі [5, с. 99].

Найважнейшы метад народнага выхавання на Палессі быў метад практыкаванняў ці прывучэння. У народзе прыкмецілі, што шматкратна паўтараемыя дзеянні паступова пераходзяць у навыкі, потым у звычкі і ўтвараюць устойлівую лінію паводзін. Практычнаму ажыццяўленню гэтага метаду ў значнай ступені садзейнічалі народныя традыцыі, звычаі, абрады. Кожны з іх з'яўляецца сапраўднай школай, дзе практычна ўсе кампаненты мелі выразна выхаваўчую скіраванасць.

Надзвычай важнае месца ў народным выхаванні займае метад прыкладу. У народзе заўважалі схільнасць дзяцей да перайманія, таму стараліся, каб у жыцці пастаянна прысутнічалі ўзоры для пераймання. У якасці такіх маглі выступаць героі казак, калыханак, легенд і іншых фальклорных твораў. Асабліва дзейсны ўплыў аказвалі прыклады з навакольнай рэчаіснасці. Цэнтральнае месца адводзілася прыкладу бацькоў. Палешукі актыўна выкарыстоўвалі натуральны дыдактычны прыём "Рабі як я". У якасці перасцярогі ад непажаданых дзеянняў і ўчынкаў, актыўна выкарыстоўваліся адмоўныя прыклады.

Істотнае месца ў выхаваўчым працэсе займалі ўнушэнні, парады, павучанні, гутаркі і іншыя. Найважнейшымі выхаваўчымі сродкамі з'яўляліся ўсе віды і жанры народнага фальклору. У этнічнай педагогіцы Мазырскага Палесся актыўна выкарыстоўваліся метады і сродкі, якія не ўласцівы інстытулізаваным выхаваўчым сістэмам. Гэта ў першую чаргу благаславенне, добрае або ліхое пажаданне, папрок, абяцанне, клятва, праклён, адрачэнне і інш.

У шырокім ужытку сем'яў палешукоў былі такія метады, як заахвочванне, асуджэнне і пакаранне. Трэба адзначыць, што ўзнагарода, пахвала выкарыстоўваліся не так часта, затое ўзважліва і абгрунтавана. У народзе лічылі, што "лепей не дахваліць чым перахваліць", таму характар выхаваўчага ўздзеяння быў больш вытрыманы, строгі. Усё рабілася для таго, каб недапусціць перарастанне выхавання ў пеставанне дзяцей, бо "з пестуна нічога не будзе" [8, с. 133]. Любоў да дзяцей павінна спалучацца з высокай патрабавальнасцю і строгасцю: "Любі дзіця, як душу, а калаці, як грушу" [8, с. 134], "Няшчасныя тыя дзіцяткі, якіх не жураць ні бацькі, ні маткі" [8, с. 134].

У народзе таксама разумелі, што фізічныя пакаранні самі па сабе не заўсёды эфектыўны сродак, таму заключалі: "Разумнае дзіця баіцца гразы, дурное – лазы" [8, с. 135].

Вывучэнне этнапедагагічнай спадчыны Мазырскага Палесся падводзіць да высновы, што ў народным выхаванні выкарыстоўваўся досыць шырокі арсенал метадаў і сродкаў. Прычым, у народзе імкнуліся ўжываць як мага большую іх колькасць з гэтага арсеналу. Шматлікія метады і сродкі народнага выхавання ўзаемадапаўнялі, ўзаемаўзбагачалі адзін другога і стваралі самабытную выхаваўчую сістэму, эфектыўнасць і выніковасць якой вымушае з павагай адносіцца да традыцый педагагічнай культуры і шукаць там адказы на многія праблемы сучаснай рэчаіснасці.

**Літаратура**

1. Карскі Я. Беларусы / Я. Карскі; Уклад. і камент. С. Гараніна і Л. Ляўшун; Навук. рэд. А. Мальдзіс; Прадм. Я. Янушкевіча і К. Цвіркі. – Мн.: "Беларускі кнігазбор", 2001. – 640 с. [8] с.: іл. – (Беларускі кнігазбор; сер. П. Гісторыка-літаратурныя помнікі).
2. Сербов И.А. Белорусы-сакуны. Краткій этнографическій очерк. – Птг., 1915.
3. Арлова Г.П. Беларуская народная педагогіка. – Мн.: Нар. асвета, 1993. – 120 с.: іл.
4. Дубянецкі С.Ф., Дубянецкі Э.С. Цяжкі шлях да адраджэння. – Брэст: Выд-ва С. Лаўрова, 1997. – 92 с.
5. Прыказкі і прымаўкі ў дзвюх кнігах. – Кн. 2. – Мн., 1967.
6. Пинчуки. Этнографическій сборникъ / Собрал Д.Г. Булгаковскій // Записки императорского географического общества по отделению этнографии. – Т. XIII. – Вып. 3. – СПб., 1890.
7. Десять отрывков, разнообразнаго историческаго содержанія (из сочиненія) Михалона Литвина "О нравах татар, литовцев и москвитянъ" // Архив историко-юридических сведений, относящихся до России, издаваемый Н. Калачовым. – Кн. 2. – М., 1854.
8. Касько У.К. Палескі дзівасіл: бел. нар. прыказкі, прымаўкі, выслоўі: са скарбніцы А.К. Сержпутоўскага / У.К. Касько. – Мн.: Выш. шк., 2005. – 383 с.